о репрессиях и экономических трудностях в СССР разбивалась о реальности жизни в самой Польше: коррупция, терроризм, преступность, безработица, социальные конфликты.

Деятельность КПЗБ, КСМЗБ, БСРГ, ТБШ и др. национально-ориентированных белорусских оппозиционных организаций способствовала созданию в широких массах трудового населения Западной Беларуси лояльного отношения к восточным соплеменникам.

Нападение Германии, неудачи польской армии, приближение линии фронта стимулировали у подавляющей части населения стремление найти защиту у своих братьев. Приход Красной Армии белорусский народ встретил не как агрессию, а как акт помощи и восстановления справедливости.

## З ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКА-НЯМЕЦКІХ СУВЯЗЯЎ У XVI-XVIII СТСТ.

Стралец М.В., Коршак М.А.

*Брэсцкі політэхнічны інстытут*
*Брэсцкі педагагічны універсітэт*

У 1569 годзе была падпісана Люблінская вунія. Яе галоўны вынік утварэнне Рэчы Пасаспалітай абодвух народаў. Пад абодвума народамі маюцца на ўвазе ВКЛ і Карона Польская, якія захавалі адносную палітыка-дзяржаўную самастойнасць. Рэч Паспалітая была федэрацыяй з элементамі канфедэрацыі. Яна праіснавала да 1795 года.

У 1569-1795 гадах на германскіх абшарах была вялікая колькасць нямецкіх дзяржаў, якія фармальна ўваходзілі ў склад Святой Рымскай імперыі германскай нацыі. Роля апошняй была яшчэ меншай, чым раней.

Ва ўмовах Рэчы Паспалітай Беларуска-Літоўская дзяржава мела агульную з Польшай знешнюю палітыку. У сувязі з гэтым наша краіна пашырае свае геапалітычныя інтарэсы, больш актыўна выходзіць у Заходнюю Еўропу і ўключаецца ў дыпламатыю нямецкіх дзяржаў.

Германскі напрамак значна актывізаваўся, калі каралем польскім і вялікім князем літоўскім стаў Жыгімонт Ваза. На яго знешнюю палітыку наклала адбітак заўзятая прыхільнасць каталіцкаму веравызнанню. Жыгімонт Ваза дзеля свайго ультракаталіцызму падтрымліваў германскага імператара ў яго барацьбе супраць Чэхіі і Трансільваніі. Якраз у першым перыядзе Трыццацігадовай вайны ў Еўропе ( 1618-1648 гг) адбывалася чэшскае паўстанне супраць Габсбургаў, імператараў Германіі і уладароў Аўстрыі. Жыгімонт Ваза падтрымаў імператара, хоць гэта не адпавядала стратэгічным інтарэсам дзяржавы.

У аналізуемы перыяд значна зменшыліся аб'емы гандлю беларусаў з немцамі. Сітуацыя асабліва пагоршылася ў XVII стагоддзі.

З сярэдзіны XVII стагоддзя сталі значна паслабляцца беларуска-нямецкія культурныя сувязі, асабліва ў той частцы, якая тычылася пранікнення культуры ў Германію. Прычына дадзенай неспрыяльнай тэндэнцыі каранілася ў нарастанні крызісных з'яў у развіцці беларускай культуры.

Разам з тым поўнага перарывання гэтых сувязаў не адбылося.

У беларуска-нямецкіх культурных сувязах ХУШ стагоддзя важнае месца належыць дырыжору і кампазітару У.Д.Галянду, які меў сталую службу у Нясвіжскім оперна-балетным тэатры. Высокую адзнаку сучаснікаў атрымала яго опера «Агатка, або Прыезд пана», лібрэта да якой напісаў віленскі кашталян Мацей Радзівіл.

У нямецкіх дзяржавах неаднойчы звярталі ўвагу на рэлігійную сітуацыю у ВКЛ. Вядома, што у час рэлігійных ганенняў у ХУП-ХУШ стагоддзях лютэране карысталіся падтрымкай Прусіі.

У ХУШ ст. Рэч Паспалітая становішча не столькі суб'ектам геапалітычных дачыненняў у Еўропе, колькі аб'ектам. На яе знешнепалітычнае становішча усе больш уплываюць суседнія моцныя манархіі з абсалютысцкімі рэжымамі – Расія, Прусія і Аўстрыя.

У гэтых умовах ей як ніколі патрабавалася выдатная постаць на каралеўскім троне. Аднак падзеі развіваліся насуперак дадзенаму патрабаванню. З 1697 па 1763 гг. каралямі польскімі і вялікімі князямі літоўскімі былі немцы, якія не разумелі сапраўдных інтарэсаў і Кароны польскай, і Вялікага княства Літоўскага. Размова ідзе пра Аўгуста Моцнага (1670-1733) і яго сына Аўгуста III (1696-1763). Яны адначасова былі саксонскімі курфюрстамі, часта прымалі памылковыя рашэнні, якія мелі вельмі сур'езныя наступствы і былі на руку ворагам нашых суайчыннікаў.

Прусія мела непасрэднае дачыненне да таго, што у 1795 годдзе Рэч Паспалітая знікла з палітычнай мапы свету і, натуральна, перастала існаваць Вялікае княства Літоўскае, Рускае, Жамойцкае.

Васемнаццатае стагоддзе азнаменавала новы этап у беларуска-нямецкіх адносінах, калі у Брэст-Літоўскім уездзе Гародзенскай губерніі у 1790 г. выхадцамі з Вюртэнберга былі заснаваны калоніі Нейброў і Нейдорф. З іх дзейнасцю пачыналася новая старонка у тагачасных беларуска-нямецкіх сувязях.

## ИСТОРИЯ РЕШЕНИЯ ПРОБЛЕМЫ ВОССОЕДИНЕНИЯ БЕЛОРУССКОГО НАРОДА

Кудрицкая Е.Г.

*Брестский политехнический институт*

События 1939 года все дальше и дальше отходят в историю. На протяжении вот уже 60 лет эта тема волнует многих историографов. С позиции сегодняшнего дня мы пытается дать объективную оценку сталинско-молотовской дипломатии. Мы критикуем ее за негибкость, безнравственность. Однако не стоит концентрировать внимание только на вопросах морали и нравственности. Следует учитывать и такой важный фактор международных отношений и внешней политики, как переплетение различных государственных интересов, пусть даже понимаемых с точки зрения сегодняшнего дня, как